варкіх антрапонімаў: «Мянушка Воспан успрымаецца як напамін пра былую рубельскую шляхту. Вядома, што словы васпан і васпані служылі формай ветлівага звароту ў шляхецкім асяроддзі. Ці выкарыстоўвалася раней вяскоўцамі слова васпан як зваротак да асобы, цяпер цяжка сказаць. У гаворцы яно як акрамя мянушкі больш ніяк не выяўляецца» [1, с. 187]. Характарыстыкай маўлення вясковай жанчыны з’яўляецца мянушка Майнэрыха, аснова ўтварэння якой – часта ўжывальнае дыялектнае слова: «У рубельскай гаворцы ўжываецца слова майна са значэннем *‘трава, якая расце на вадаёмах’. «Пойду нарву* майны свінням» ці «Поўны кошэль майны прынэсла», – гаварыла вясковая жанчына. Пачутае некалькі разоў суседзямі рэдкаўжывальнае слова з вуснаў рублянкі прадвызначыла яе мянушку – Майнэрыха» [1, с. 188]. Ужыты ў творах М. Пашкевіча мянушкі-празванні паводле месца жыхарства вяскоўца. Так, у сялянскім асяроддзі прынята называць замужніх жанчын паводле вёскі, дзе яны жылі да замуства: «Дуброўчанка *(ад назвы вёскі* Дуброва), Вэлемічанка *(ад* – Вялемічы), Ольпенка *(ад* – Альпень), Хотомлянка *(ад* – Хотамель)» [1, с. 185].

З’яўляючыся найбольш старажытным разрадам антрапанімічнай лексікі, мянушкі працягваюць сваё жыццё ў асяроддзі сучасных вяскоўцаў, даючы ім магчымасць ярка абмаляваць найбольш кідкія рысы знешнасці чалавека, апісаць і ацаніць яго характар і маўленне, акрэсліць сваяцкія адносіны паміж людзьмі. А каштоўнасць сямейна-родавых (генесіянімічных) і калектыўна-тэрытарыяльных мянушак у тым, што яны захоўваюць інфармацыю аб гісторыі продкаў сям’і і жыхароў пэўнага населенага пункта.

У кантэксце твораў М. Пашкевіча актуалізуецца этымалагічная семантыка мікратапонімаў, якія захоўваюць каштоўную інфармацыю пра характар гаспадарання рубельцаў («Назваў Волыня рубельцы абазначылі луг, дзе раней пасвілі валоў – непаваротлівых, але цягавітых жывёлаў: імі даводзілася араць зямлю, выконваць іншыя сельскагаспадарчыя работы» [1, с. 167]); пра вяскоўцаў – уладароў зямлі («Ёсць у лексіцы вёскі Рубель назва ўрочышчаў, утвораныя ад асабовых імёнаў: Іваночковэ, Косцючковэ. *Гэтыя мікратапонімы захоўваюць памяць пра гаспадароў, якія некалі мелі і па-сялянску дбацна апрацоўвалі ўласную зямлю»* [1, с. 167]); пра сацыяльную структуру вясковай грамады («У цэнтральнай частцы вёскі жыла шляхта*; за царквою, бліжэй да Хатомеля,* – мужыкі, *што і адлюстравалася ў мікратапонімах сяла:* Шляхта *і* Мужыкі [1, с. 24–25]»).

Такім чынам, анамастыкон навукова-папулярных твораў М. Пашкевіча мае агульнабеларускі нацыянальны характар. Шырока прадстаўлены ў ім рэгіянальны кампанент. Ядром сістэмы асабовых імёнаў, адлюстраванай у творах, з’яўляецца хрысціянскі іменаслоў, асвоены нацыянальнай мовай і мясцовай гаворкай. Інфармацыйная нагрузка мянушак і тапонімаў перадае асаблівасці ўспрымання і ацэнкі вяскоўцамі знешнасці, маральных якасцей, паводзінаў асобы, а таксама адлюстроўвае сацыяльную структуру социуму, асаблівасці гаспадарчага жыцця рубельцаў.

### *ЛІТАРАТУРА*

1. Пашкевіч, М. І. У родным слове адгукаецца душа / М. І. Пашкевіч. – Брэст : Альтернатива, 2012. – 196 с.



***Воюш І. Д. (Мінск, Беларусь)***

## САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ ЯК ІНСТРУМЕНТ ПАЧАТКОВАЙ АДАПТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ-ПЕРШАКУРСНІКАЎ: З ВОПЫТУ ПРАЦЫ

Паводле штогадовага медыядаследавання GemiusAudience за 2017 год, колькасць карыстальнікаў інтэрнэту ў Беларусі складае амаль 80 % насельніцтва. Несумненная большасць з іх– карыстальнікі сацыяльных сетак. Ва ўзроставай катэгорыі ад 15 да 24 гадоў байнэт налічвае да 98 % насельніцтва, што зарэгістраваны ў сацыяльным нэтварку. Несумненна, такі важны інструмент уздзеяння на студэнцкую моладзь мусіць быць выкарыстаны ў навучальным і выхаваўчым працэсе сучаснай установы вышэйшай адукацыі.

У нашым матэрыяле пад сацыяльнымі сеткамі мы будзем разумець найперш платформу «Укантакце» як самую масавую паводле колькасці маладых карыстальнікаў, а таксама «Інстаграм» як сетку, куды паступова мігрыруе аўдыторыя цінэйджэраў. (Для параўнання: колькасць падпісчыкаў ва «Укантакце» на адкрытыя старонкі БДУІР – 10 тыс., БДПУ – 17 тыс., на старонку БДУ – 29 тыс., на закрытую старонку МДЛУ – 19 тыс. Падпісчыкаў на акаўнт «Інстаграм» БДПУ– 4 тыс., БДУ – 4 тыс., БДУІР – амаль 1,5 тыс., МДЛУ – каля тысячы.) Усё гэта сведчыць, што для студэнтаў, народжаных у 2000-я гады, дыгіталізаваная рэальнасць – паўсядзённая з’ява, а віртуальнае жыццё – натуральны «лічбавы» працяг іх асобы.

Якія перавагі маюць стасункі са студэнцкай аўдыторыяй на сацыяльных платформах у першыя месяцы навучання ва ўніверсітэце? На сёння большасць маладых людзей (каля 52 %) выходзяць у сеціва – сацсеткі, месэнджары, пошукавыя сістэмы, навінную рассылку – з мабільнай прылады. Такім чынам, мы маем амаль кругласутачны доступ да карыстальніка. Імгненнасць дастаўкі тэксту, галасавых паведамленняў, выяў, масавая рассылка і асабістыя паведамленні, хараналагічныя запісы, убудаваныя мікраблогі, рэпосты з давераных крыніц даюць неабмежаваныя магчымасці па камунікаванні з аўдыторыяй, у тым ліку хуткую зваротную сувязь.

Якія канкрэтныя крокі можа прадпрымаць куратар акадэмічнай групы па адапатацыі першакурснікаў, выкарыстоўваючы магчымасці сеціва? Куратарская служба, якая працуе праз сацыяльныя медыя, займаецца акадэмічнай, псіхалагічнай, сацыяльна-бытавой адаптацыяй першакурснікаў [3].

Акадэмічная адаптацыя. У плане пераадолення «дыдактычнага крызісу» сацсеткі дазваляюць упісаць неафіта ў атмасферу факультэта, паказаць шляхі карэктнага ўзаемадзеяння з факультэцкай рэчаіснасцю (у тым ліку ў крытычных сітуацыях), даць інструменты авалодання сітуацыяй, прыняцця эфектыўных рашэнняў, сфарміраваць крытычны падыход да навакольнага асяроддзя, да крыніц інфармацыі, даць інструменты яе пошуку, алгарытмы інтэлектуальных дзеянняў.

Вопыт заходнееўрапейскіх універсітэтаў і ўстаноў вышэйшай адукацыі ЗША паказвае, што адаптацыя мусіць найперш закрануць дыдактычную сферу. На сайце, унутраным або афіцыйным, заўжды афармляецца старонка skills4study – пра тое, як вучыцца самастойна, дзе знайсці месца для заняткаў у кампусе, бібліятэцы, вучэбным корпусе, у горадзе, на вольных пляцоўках, у бліжэйшых кавярнях і інш. Тамсама падаюцца звесткі пра акаўнты, якія студэнт павінен зарэгістраваць на ўніверсітэцкім сайце, каб карыстацца рэсурсамі віртуальнага ўніверсітэта (асабісты кабінет, рэпазіторый, бібліятэка, інтэрнат, басейн, трэнажоры). Напрыклад, С. Дру, Р. Бінгхэм у хэндбуку «Мастацтва быць студэнтам» прапануюць некалькі блокаў акадэмічных кампетэнцый, якімі мусіць авалодаць студэнт – гэта матывацыя, мэтапакладанне, крытычнае мысленне, самастойнасць, праца ў камандзе, тайм-менеджмент, спосабы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рашэння задач [1]. С. Котрэл арганізуе названыя кампетэнцыі ў чатыры блокі – праца з людзьмі, рашэнне праблем, крэатыўнасць мыслення і самаарганізацыя [2].

У штодзённай працы са студэнтамі малодшых курсаў найчасцей выкарыстоўваюцца выдатныя інфармацыйныя пляцоўкі – суполка акадэмічнай групы ў ВК, агульная гутарка і афіцыйная старонка факультэта. Калі там прыстунічае куратар і выкладчыкі, то гэтыя пляцоўкі працуюць да ўсяго яшчэ і як арганізацыйна-навучальны рэсурс. Выкладчык можа размясціць гайды па адрозненні тыпаў заняткаў і асаблівасцях падрыхтоўкі да іх, параіць крыніцы інфармацыі і формы падрыхтоўкі, запрасіць старшакурснікаў аказаць дапамогу малодшым, дапамагчы разабрацца, як карыстацца раскладам, дзе знайсці яго і свежыя абнаўленні дэканата ў электронным выглядзе, фактычна ў любы час патлумачыць заданні альбо ўдакладніць іх.

Псіхалагічная адаптацыя. Асноўныя задачы гэтага аспекту прыстасавання – зняць псіхалагічнае напружанне, зменшыць стрэс навізны, страх невядомасці, сфарміраваць новыя паводзінныя патэрны, стабілізаваць нервова-псіхічны стан, перайначыць стасункі з суб'ект-аб'ектных («вучыце мяне») у суб'ект-суб'ектныя («я вучуся – вы вучыце»), перадаць маладой асобе адказнасць за ўласнае жыццё, выхаваць самастойнасць, незалежнасць поглядаў, асэнсаванае стаўленне да ўласных рашэнняў.

Псіхалагічная, нават псіхафізіялагічная, адаптацыя старэйшых падлеткаў адбываецца паралельна з дыдактычнай у першыя тыдні вучобы і праходзіць у межах акадэмічнай групы, факультэцкай супольнасці. Падчас яе наладжваюцца стасункі групы і асабіста кожнага студэнта з выкладчыкамі і адміністрацыяй, змяняецца і аўтакамунікацыя, бо сцыяльныя каардынаты змяшчаюцца ў сувязі са зменай некаторых відаў вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці і атачэння.

Выдатныя магчымасці прадстаўляюць сацыяльныя сеткі ў дыягностыцы эмацыянальна-псіхалагічнага мікраклімату ў групе, своечасовага выяўлення элементаў тролінгу, булінгу, харасмэнту. Асабліва ярка псіхалагічны стан, некаторыя паказчыкі дэпрэсіі ў старэйшага падлетка відаць праз тэматыку рэпостаў і ступень агрэсіўнасці каментароў. Такім чынам, становіцца магчымай прафілактыка дэвіянтных паводзін, нервовых зрываў, сіуцыдальных спроб.

Тамсама куратар можа вылучыць захапленні, каштоўнасці, хобі, асаблівасці светаўспрымання сваіх студэнтаў дзеля больш дакладнага планавання выхаваўчай працы. Паводле пакінутых каментароў – ацаніць ступень агрэсіі альбо прыняцця чальцоў групы, іх стасункі і сацыяльны статус. Карысным будзе вылучыць перавагі ў тым, як студэнты бавяць час, якую кінапрадукцыю выбіраюць, якія кнігі чытаюць.

На нашу думку, для псіхалагічнай адаптацыі найбольшы патэнцыял мае платформа «Інстаграм». Выявы і эмодзі, гісторыі і трансляцыі, відэа і анімацыйныя прылады, асабісты кантэнт і мікрапосты маюць карацейшы шлях да ўнутранага свету студэнта, чым аб'ектыўная тэкставая інфармацыя поста ў паўнафарматнай сацсетцы. Усё гэта павышае ступень даверу да матэрыялаў па адаптацыі. Менавіта таму псіхалагічная служба ўстаноў вышэйшай адукацыі часта абірае «Інстаграм». Структура поста псіхалагічнай службы – яркая выява / мем / атмасфернае фота і карткі структураваны тэкст кшталту «Што рабіць, калі табе…», «10 спосабаў…» альбо ўдалая цытата па тэме.

Асаблівасць працы па псіхалагічнай адаптацыі – гэта яе індывідуальны характар, немагчымасць праводзіць дыягнастычную і тэрапеўтычную работу анлайн, абавязковае прыцягненне куратарам / выкладчыкам спецыялістаў. Куратар можа размяшчаць для студэнтаў нефармальныя парады падчас крытычных фаз адаптацыі: перад першай сустрэчай з групай, напярэдадні семінарскіх заняткаў, да першай заліковай сесіі, потым да экзаменацыйнай. Таксама складанымі, пераломнымі для першакурснікаў становяцца другая палова снежня і траўня, менавіта ў гэты час вопытныя куратары для прафілактыкі дэвіяцый транслююць жыццесцвярджальны кантэнт па тэме «Каштоўнасць чалавечага жыцця», "Няма невырашальных праблем» і інш.

Сацыяльна-бытавая адаптацыя. ПВС і актыў факультэта могуць пазнаёміць студэнтаў з выгодамі і выдаткамі пражывання ў інтэрнаце, арганізаваць камфортны ўваход у інтэрнацкае жыццё, пазнаёміць з яго традыцыямі, даць узоры бесканфліктных зносін у разнароднай несфарміраванай групе.

Тэматычныя суполкі «Укантакце» адкрываюць шырокія магымасці для суправаджэння засялення ў інтэрнат, мерапрыемстваў кшталту Дня ведаў, агульнаўніверсітэцкіх масавых праектаў тыпу Дня першакурсніка, Дня нараджэння ўніверсітэта і інш., падтрымання сувязяў з унутрыўніверсітэцкімі студэнцкімі арганізацыямі. «Укантакце» – гэта дошка аб'яў ад адміністрацыі, ад мясцовых ячэек прафсаюзаў, ад дэканата і студэнцкага актыву.

Нефармальную частку сацыяльна-бытавой адаптацыі звычайна ўскладаюць на студэнтаў старэйшых курсаў, але і выкладычку-куратару нельга быць у баку ад гэтай працы, каб парады «хаджалых» не ішлі ў разрэз з матывацыяй вучэння, этычных і адэкватных зносін у калектыве. Карыснымі на пачатковых этапах адапатацыі будуць кураторскія посты / рэпосты ў сацсетцы, відэапрактыкумы па метадзе навядзення і падтрымання парадку ў рэчах і паперах КонМары, нават ручнога мыцця бялізны, кулінарныя падборкі танных хуткіх страў , а таксама па навігацыі ў горадзе і карпусах універсітэта.

Асаблівае значэнне ў адукацыйна-выхаваўчым працэсе мае вядзенне суполкі «Падслухана», якая стала традыцыйнай у многіх навучальных установах. Там можна адсачыць наспелыя праблемы, пабачыць нефармальны водгук на факультэцкія і ўніверсітэцкія мерапрыемствы, скарыстацца студэнцкімі прапановамі па паляпшэнні ўмоў навучання, выхавання, пражывання ў інтэрнатах, аператыўна зрэагаваць на канфліктную сітуацыю, даць магчымасць адбыцца «выбуху» незадаволенасці, зняць напружанне. Менавіта праз гэта выкладчку і куратару неабходна абавязкова наведваць старонку «Падслухана», пры гэтым не замінаючы сваімі каментарыямі вольна выказвацца маладым.

Такім чынам, першасная адаптацыя студэнтаў адбываецца па трох асноўных накірунках – акадэмічная, псіхалагічная, сацыяльна-бытавая. І ў гэтым працэсе адчувальна дапамагчы могуць самыя масавыя ў рускамоўным сегменце інтэрнэту сацыяльныя сеткі «Укантакце» і «Інстаграм».

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Дрю, С. Искусство быть студентом. Руководство по навыкам обучения / С. Дрю, Р. Бингхэм; пер. с англ. – М. : ГИППО, 2004. – 304 с.
2. Коттрелл, С. Успешная учеба в вузе. Самые важные навыки студента / С. Коттрелл. – М. : ЭКСМО, 2015. – 368 с.
3. Куницкая, О. Стартовый потенциал студентов-первокурсников: факторы успешной адаптации / О. Куницкая // Народная асвета. – 2015. – № 12. – С. 8–11.



*Ганчарова-Цынкевіч Т. У. (Мінск, Беларусь)*


## МАКСІМ ТАНК – ПЕРАКЛАДЧЫК ПАЭЗІІ АЛЯКСАНДРА ПУШКІНА

Мастацкі пераклад – гэта сінтэз дзвюх антытэз – стварэння жывога цэлага і напружанай тэхнічнай працы, творчага палёту і адзінаборства са словам як з матэрыялам, які супраціўляецца, як гэта ўласціва матэрыялам наогул. Добры паэтычны пе-




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ